# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

УДК 008+378]-057.4+929:008(476) Грыгаровіч Я. Д.

*Ю. У. Міцкевіч*

## Брэнд асобы, ці Жыццё, напоўненае сэнсам

*Абгрунтоўваецца неабходнасць вывучэння культурнай і духоўнай спадчыны Ядвігі Дамінікаўны Грыгаровіч, асэнсавання яе вобраза мыслення і паводзін, якія дапамагаюць вызначыць шляхі да фарміравання брэнда асобы.*

У сучаснай сацыякультурнай прасторы ўсё часцей ужываецца паняцце «брэнд асобы». Тэрмін з'яўляецца адносна новай з'явай для беларускай рэчаіснасці. Гісторыю стварэння асабістых брэндаў можна прасачыць з часоў Цэзара і Клеапатры альбо з яшчэ больш ранніх эпох – узнікненне тактыкі самапрэзентацыі ўзыходзіць да часоў фарміравання арганізаваных чалавечых супольнасцей. Упершыню на навуковым узроўні паняцце «personal branding» выкарыстоўваецца ў рабоце Т. Пітэрса (1997) – аднаго з вядомых амерыканскіх пісьменнікаў, стваральніка практык па кіраванні бізнесам [7]. На думку Т. Пітэрса, персанальны брэнд – гэта ўяўленне людзей аб канкрэтным чалавеку, тыя ідэі і асацыяцыі, якія пэўная асоба выклікае ў свядомасці прадстаўнікоў грамадскасці [7]. Вядомы замежны навуковец Ф. Котлер разглядае персанальны брэндынг як працэс, ці комплекс маркетынгавых мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю персоны, яе прафесійных і асабістых якасцей у вачах мэтавай аўдыторыі [5, с. 27].

Адзначым, што сёння не існуе энцыклапедычна зафіксаваных паняццяў «брэнд асобы», «персанальны брэнд», «брэнд кіраўніка», «асабісты імідж». На наш погляд, можна вылучыць наступныя складнікі брэнда асобы: а) надзелены сумай пэўных якасцей; б) мае выбітную біяграфію (бацькі, адукацыя, кар'ерныя поспехі і інш.); в) кампетэнтны ў якой-небудзь галіне; г) сабраў вакол сябе шырокае кола аднадумцаў; д) заслужыў добрую рэпутацыю і інш. Стварэнне брэнда пэўнай асобы адбываецца ў працэсе прафесійнага і жыццёвага сталення, набыцця вопыту, калі карысць ад учынкаў, дзейнасці, становіцца відавочнай.

Постаць Ядвігі Дамінікаўны Грыгаровіч, духоўна багатай Жанчыны, выдатнага беларускага вучонага ў галіне педагогікі, культуралогіі, члена-карэспандэнта Беларускай акадэміі адукацыі, прадбачлівага кіраўніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (1992–2007), клапатлівай жонкі і маці натхняе нас да разваг, які шлях трэба прайсці, каб стварыць брэнд сябе.

Аналізуючы жыццёвы шлях, навуковыя і публіцыстычныя працы, артыкулы, прысвечаныя Я. Д. Грыгаровіч, успамінаючы сустрэчы з ёю, мы вылучылі асноўныя крытэрыі, адпаведна якім можна казаць пра персанальны брэнд.

**Знешні выгляд, позірк, голас, жэстыкуляцыя, міміка, паходка, адзенне – усё тое, што фарміруе першае ўражанне аб чалавеку.** Я. Д. Грыгаровіч умела спакойна размаўляць, пранікнёна глядзець на субяседніка і вельмі ўважліва яго слухаць. Здавалася, што яна чытае твае думкі і ўжо ведае загадзя, якім будзе адказ на пытанне. Павольныя і адначасова ўпэўненыя крокі Я. Д. Грыгаровіч дэманстравалі ўнутраны супакой і пачуццё ўласнай годнасці.

Яе заўсёды элегантны знешні выгляд, бездакорны строй сведчылі пра ўнутраную працу над сабой і стваралі непаўторны вобраз прывабнай жанчыны з арыстакратычнымі манерамі. У навуковых працах Ядвіга Дамінікаўна, клапоцячыся аб будучых спецыялістах у галіне культуры і мастацтва, неаднаразова падкрэслівала, што артыстызм, тэмперамент выхаваццеляў з'яўляюцца ўплывовымі сродкамі ўздзеяння, калі скарэкціраваны педагагічнай мэтазгоднасцю [3, с. 232].

**Каштоўнасная аснова дзейнасці.** На нашу думку, сэрца Я. Д. Грыгаровіч прагнула вялікага, яна мела мары высокага палёту. Яе прафесійная актыўнасць была звязана з захаваннем, стварэннем, распаўсюджваннем культурных, гуманістычных каштоўнасцей. Ядвіга Дамінікаўна – хрысціянка з вялікай літары, яна з энтузіязмам працавала дзеля духоўнага адраджэння краіны ў цэлым і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у прыватнасці. Яна выпраменьвала дабро і любоў, дэманстравала духоўную моц, таму да яе цягнуліся як людзі старэйшага пакалення, так і моладзь. Я. Д. Грыгаровіч сцвярджала: «Імкненне да прыгажосці і дабра – важнейшы бок светапогляду педагога, цэментуючы яго майстэрства» [3, с. 217].

Ядвіга Дамінікаўна разглядала эстэтычную накіраванасць як стрыжнёвае ўтварэнне эстэтычнай свядомасці чалавека. «Эстэтычнае праяўляецца не ў прамым сэнсе спажывання, не ў выкарыстанні прадметаў, а ў іх успрыманні, любаванні, зачараванні імі», – адзначала яна [2, с. 14]. Гэтае меркаванне запрашае чалавека любога ўзросту да разважання.

**Самастойнасць мыслення.** Я. Д. Грыгаровіч падтрымлівала ідэі беларусізацыі, размаўляла толькі на роднай мове, культывавала беларускае слова і за межамі краіны. Калі Ядвіга Дамінікаўна звярталася да сваіх калег, студэнтаў, яна ўмела адмыслова рабіць паўзы, кожнае слова надзяляючы сэнсам. Я. Д. Грыгаровіч падкрэслівала: «Мова педагога павінна быць не механічным гаварэннем, а сапраўды пераканаўчай, шчырай, праўдзі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вай формай перадачы думкі. Гэтыя эмацыянальныя нюансы патрабуюць авалодання такімі моўнымі ўменнямі, як вобразнасць, лексічнае багацце, перакананасць, унушальнасць, выразнасць, лагічная стройнасць, культура, даступнасць» [3, с. 233]. Пераасэнсоўваючы словы Я. Д. Грыгаровіч разумееш, чаму яе публічныя выступленні былі такімі пранікнёнымі, краналі да глыбіні душы.

**Узровень прафесіяналізму.** Я. Д. Грыгаровіч шмат у чым была першай: адзіная рэктар-жанчына Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; першы беларускі доктар педагагічных навук па спецыяльнасці «тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці». Я. Д. Грыгаровіч 15 гадоў на пасадзе рэктара рупліва працавала на ніве беларускай культуры, ушаноўвала матчыну мову на працы і дома, была адданая роднаму краю, мэтанакіравана займалася папулярызацыяй нацыянальнай культуры за межамі краіны.

Існуе пэўная колькасць паказчыкаў узроўню кампетэнтнасці спецыяліста ў любой галіне, але найбольш складана адпавядаць наступным: па-першае, шчыра дзяліцца назапашанымі ведамі, уменнямі, навыкамі, а па-другое, падрыхтаваць ці ўбачыць і падтрымаць паслядоўніка тваёй справы. Ядвіга Дамінікаўна шмат гадоў плённа працавала на ніве выкладчыцкай дзейнасці, заўсёды з энтузіязмам дзялілася назапашанымі ведамі, вопытам, смела расчыняла насцеж дзверы свайго сэрца. На нашу думку, працаваць з ёю было камфортна тым, хто меў адкрытае, шчырае сэрца, старанна выконваў прафесійныя абавязкі, радаваўся поспехам бліжняга.

Я. Д. Грыгаровіч аб'яднала людзей «з аднолькавай групай крыві». У 2013 г. на пасаду рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прызначаны Ю. П. Бондар, які з 2001 г. паспяхова будуе адносіны з прафесарска-выкладчыцкім саставам і студэнтамі. Захоўваючы добрыя традыцыі, якія склаліся падчас працы ва ўніверсітэце з Я. Д. Грыгаровіч, Ю. П. Бондар актыўна, з пачуццём выключнай адказнасці і тактычнасці пашырае далягляды адукацыйнай, навукова-даследчыцкай, выхаваўчай дзейнасці. Як руплівец-кіраўнік, Юрый Паўлавіч запрашае да канструктыўнага супрацоўніцтва таленавітых навукоўцаў, выкладчыкаў, знакамітых дзеячаў культуры, падтрымлівае наватарскія творчыя ініцыятывы калектыву, спрыяе развіццю інавацыйных форм і жанраў сучаснага мастацтва, адстойвае інтарэсы навучальнай установы ў межах грамадска-палітычнай дзейнасці, чым, безумоўна, садзейнічае росквіту Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

**Узровень медыйнасці. Рэйтынгі.** Спецыялісты ў галіне персанальнага брэндынгу А. П. Кіселіца, Л. Я. Замураева, А. П. Пінігіна заўважаюць, што часта асобе прадстаўнікамі мэтавай аўдыторыі прысвойваецца значная роля, напрыклад:

– эксперт або аўтарытэт у канкрэтнай галіне;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– эталон, узор для пераймання для некаторай групы;
– выразнік думак некаторай групы [4].

На нашу думку, брэнд асобы Я. Д. Грыгаровіч стаў увасабленнем аднаго з самых прыгожых, духоўна ёмістых напрамкаў чалавечай дзейнасці – культуры і мастацтва. Яна была і экспертам у галіне педагогікі, культуралогіі, і эталонам кіраўніка для многіх калег і студэнтаў. Ядвіга Дамінікаўна мела добры густ, спрыяла фарміраванню і развіццю крэатыўнага руху, займалася папулярызацыяй дасягненняў творчых калектываў універсітэта. Палітыкі, дыпламаты, дзеячы культуры з задавальненнем прымалі запрашэнні Я. Д. Грыгаровіч да ўдзелу ў шматлікіх сацыякультурных праектах.

У 1996 г. Ядвіга Дамінікаўна названа Жанчынай года ў галіне педагагічных навук і асветы міжнароднай арганізацыяй «Усебеларускі жаночы фонд прападобнай Еўфрасінні Полацкай» [1]. Пра ўзвышэнне на міжнародным п'едэстале сведчыць той факт, што ў 2002 г. Амерыканскім біяграфічным інстытутам Я. Д. Грыгаровіч названа Чалавекам года ў галіне навукі [1].

Жыццёвы шлях Я. Д. Грыгаровіч пераконвае ў тым, што яна заўсёды была вернай свайму прызначэнню – жыць і працаваць дзеля людзей, на карысць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і свайго роднага краю.

**Адносіны да сацыяльнага асяроддзя.** Мы ўжо адзначалі, што Ядвіга Дамінікаўна мела вялікую колькасць прыхільнікаў. Яна лічыла, што «выхаванасць эмпатыі дасягаецца разуменнем прыярытэту і самакаштоўнасці кожнага чалавека <…> у мэтанакіраваных гуманістычных стасунках, суперажыванні эмацыянальнаму стану іншага чалавека і ўменні адгукнуцца на яго» [2, с. 4]. Калі Я. Д. Грыгаровіч звярталася да калег, адчувалася цеплыня яе душы, якая перадавалася праз мяккі тэмбр голасу, мілагучную гаворку і неверагодна чуллівыя пажаданні. Клопат Я. Д. Грыгаровіч аб родных, калегах па працы і нават незнаёмых людзях сведчыць аб яе высокім маральна-этычным узроўні развіцця. Яна ведала патэнцыял кожнага, з кім працавала, і з даверам даручала самыя адказныя заданні. Ядвіга Дамінікаўна атуляла сваіх выхаванцаў, калег мацярынскай цеплынёй, пяшчотай, стварала адчуванне абароненасці і спакою.

Я. Д. Грыгаровіч была чалавекам энцыклапедычных ведаў, з фенаменальнай памяццю, аднак бар'ера паміж суразмоўцамі ніколі не ставіла. Умела гаварыць і з простым чалавекам, і з інтэлектуалам. Я. Д. Грыгаровіч умела прымаць мудрыя рашэнні, знаходзіць выйсце са складанай сітуацыі, падтрымаць словам і канкрэтнымі дзеяннямі. У 2011–2012 гг. Я. Д. Грыгаровіч дапамагла аўтару артыкула парадамі, рэкамендацыямі пры напісанні кандыдацкай дысертацыі, прадвызначыла прафесійны лёс. Толькі значна пазней прыйшло разуменне, наколькі прадбачлівай была Я. Д. Грыгаровіч, яе вера ў паспяховы вынік супрацоўніцтва аўтара ар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыкула з кандыдатам педагагічных навук, прафесарам, кіраўніком дысертацыйнага даследавання А. А. Макаравай натхняла да новай карпатлівай працы. Сёння яшчэ больш усведамляецца, што толькі духоўна моцны чалавек мог так матывавана, бескарысліва, з поўнай самааддачай дапамагаць студэнтам, аспірантам, выкладчыкам. Яна давала прыклад узорных паводзін старэйшага педагога ў дачыненні да маладога аўтара-даследчыка.

**Кіраванне часам і духоўныя скарбы.** Ядвізе Дамінікаўне Грыгаровіч наканавана было прайсці вельмі яскравы, адметны жыццёвы круг. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна Я.Д.Грыгаровіч была з намі, здзіўляла і захапляла артыстызмам, прыгажосцю душы, добразычлівасцю.

Нават калі Я. Д. Грыгаровіч было вельмі цяжка працаваць, яна казала: «Нельга сябе шкадаваць, трэба быць удзячным за ўсё, што маеш, і імкнуцца паспець зрабіць шмат добрых спраў». На наш погляд, Я. Д. Грыгаровіч запрашала да глыбокай радасці, якую можа спазнаць толькі духоўна сталы чалавек.

Дзякуючы намаганням Я. Д. Грыгаровіч, і ўнутраная, і знешняя прыгажосць пачала панаваць ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Я. Д. Грыгаровіч умела чакаць «заўтра», цаніла прыгажосць кожнага моманту. Яна давала маладзейшым прыклад паслядоўнасці.

Сёння можна толькі здагадвацца пра галоўную мэту ў жыцці Ядвігі Дамінікаўны, але мы ўпэўнены ў яе духоўным змесце. Я. Д. Грыгаровіч мэтанакіравана рабіла дабро, выходзіла на перыферыю чалавечага жыцця, каб несці людзям разумнае і вечнае. Яна была святлом надзеі, што вельмі сімвалічна, бо па волі Святога Айца Францішка 2016 год адзначаецца каталіцкай царквой як Год Міласэрнасці і Надзеі. Мяркуем, што Я. Д. Грыгаровіч і сёння клапоціцца пра сваіх бліжніх, назірае ласкава з вышынь і цешыцца са шматлікіх добрых перамен у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Духоўныя намаганні, талент Я. Д. Грыгаровіч моцна ўздзейнічалі на моладзь, аб'ядноўвалі калектыў навучальнай установы ў супольнасць, дзе і зараз пануюць узаемапавага і любоў. Я. Д. Грыгаровіч валодала выключным дарам разумення патрэб бліжняга, запальвала агнём веры тых, хто імкнуўся штосьці змяніць да лепшага ў сваім жыцці. Яна ўмела адчуць настрой чалавека, цікавілася не толькі прафесійнымі справамі, але і асабістым жыццём, магла кароткай рэплікай падтрымаць, суцешыць, падбадзёрыць.

Лёс не заўсёды песціў Я. Д. Грыгаровіч, і тое, як гэта мужная жанчына прымала Божую волю, за ўсё казала «дзякуй», сведчыць аб яе духоўнай дасканаласці. З яе веры нараджалася новая будучыня. Выйсці насустрач іншаму чалавеку, не чакаючы, калі ён скажа пра свае патрэбы, было звычайным для Я. Д. Грыгаровіч, таму кожны яе дзень можна лічыць духоўна плённым.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пранікнёныя радкі з верша А. Ліхадзіеўскай лепш за ўсё адлюстроўваюць шлях да духоўнай сталасці Я. Д. Грыгаровіч:

Усясільны! З табой мужнела,
Спатыкалася, зноў ішла.
Я – зярнятка Тваё – дужэла,
Выспявала ў промнях святла [6, с.16].

Незвычайная працавітасць рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, яе ахвярная да самазабыцця адданасць справе, высокія чалавечыя якасці і ўчынкі выклікаюць і сёння захапленне і вялікую ўдзячнасць. У лістападзе 2014 г. ва ўніверсітэце адбылося ўрачыстае адкрыццё І Міжнароднай навуковай канферэнцыі памяці Ядвігі Дамінікаўны Грыгаровіч – таленавітага вучонага і педагога.

Безумоўна, таямніцы брэнда асобы Я. Д. Грыгаровіч трэба яшчэ працяглы час раскрываць, каб спазнаць і зразумець усю духоўную глыбіню, шматграннасць, а таксама па-сапраўднаму ацаніць яе значэнне ў гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

1. Грыгаровіч, Я. Д. : біябібліягр. паказ. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: І. П. Кажура, Т. А. Самайлюк. – Мінск : БДУКМ, 2007. – 90 с.
2. *Грыгаровіч, Я. Д.* Фарміраванне эстэтычнай накіраванасці студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі да прафесійнай сацыякультурнай дзейнасці : аўтарэф. дыс. … д-ра пед. навук : 13.00.05 ; 13.00.08 / Я. Д. Грыгаровіч ; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2002. – 43 с.
3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект / Я. Д. Грыгаровіч ; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2002. – 403 с.
4. *Киселица, Е. П.* Формирование бренда личности как средства продвижения бизнес-проектов / Е. П. Киселица // Российское предпринимательство. – 2013. – № 2 (224). – С. 125–136.
5. *Котлер, Ф.* Маркетинг от А до Я: 80 концепций, которые должен знать каждый менеджер / Ф. Котлер. – М. : Альпина Паблишер, 2014. – 211 с.
6. *Ліхадзіеўская, А. А.* Зоркай спавітая : зб. вершаў / А. А. Ліхадзіеўская. – Мінск : Кнігазбор, 2014. – 176 с.
7. *Peters, T.* The Brand Called You [Electronic resource] / T. Peters. – Mode of access: http://www.fastcompany.com/28905/brand-called-you. – Date of access: 26.12.15.

*Y. Mitskevich*

**Brand personality or Life full of sense**

*The necessity to explore cultural and spiritual heritage of Jadwiga D. Grigorovich, comprehension of her way of thinking and behavior helping to define ways to the formation of brand personality is substantiated.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 14.01.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ